НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь, твой народ дачакаецца Залацістага, яснага дня!*
*М. Багдановіч.*

№ 20 (110), ЛІСТАПАД 2010 ГОДА

**http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна**

## НАРОД ДЛЯ ПРАПАГАНДЫ САБРАНЫ

Ад работы мясцовых органаў улады залежыць сацыяльна-эканамічнае становішча нашага раёна і дабрабыт грамадзян. Заразяны з'яўляюцца самым эфектыўным механізмам рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі на месцах. Але ж вядома, што гэты механізм круціцца па загаду аднаго чалавека, а не па волі работнікаў працоўных калектываў. Тым не менш, гвалтоўна навязаная ўладамі кантрактная сістэма зрабіла сваю чорную справу. Чым бліжэй дата выбараў, тым актыўней пачалася мітусня чыноўнікаў. Усё часцей яны праводзяць розныя інфармацыйна-прапагандысцкія мерапрыемствы сярод працоўнага люду на дзяржаўных прадпрыемствах і арганізацыях. Не выключэннем стаў і гэтак званы "Адзіны дзень інфармавання". Вядома, што Беларусь дэкларыравана як сацыяльная дзяржава, галоўнай мэтай якой з'яўляецца як паступовае развіццё грамадства ў цэлым, так і рост дабрабыту кожнага асобнага грамадзяніна ў цэлым. Але, як паказала практыка, на самай справе добра рэалізаваны цалкам адваротны прынцып "Не ўлада для народа, а народ для ўлады". Інакш на гэты дзень інфармавання народ запрашалі па-людску: праз аб'явы, ладзілі сустрэчы за круглым сталом і інш. У раёне практычна не праводзілася ніводнага пасяджэння, дзе кожны чалавек свабодна, незалежна ад пасады і сацыяльнага статуса змог бы выказаць асабісты погляд на грамадскія праблемы. Затое савецкія метады работы вельмі даспадобы супрацоўнікам Шумілінскага райвыканкама. Дарэчы, за савецкім часам камуністы паводзілі сябе больш сціпла. Прыязжаў у калгас якінебудзь інструктар райкама камуністычнай партыі, чытаў лекцыю пра ""правільны курс" нешматлікім слухачам і зноў з'язджаў сабе ва ўтульны кабінет. А цяпер ідэалагічныя службы з раёна так вышкалілі кіраўніцтва працоўных калектываў, што яны па першаму званку збіраюць сваіх падначаленых сустракаць цэлыя дэлегацыі інфармацыйна-прапагандысцкіх груп. У чацвер 18 лістапада па ўсяму раёну пракаціліся прапагандысцкія рэйды. На сустрэчу з калектывам работнікаў электрасувязі і раённай пошты завітала група ідэолагаў з райвыканкама, якую ўзначаліла старшыня райсавета І. М. Новікава. Прысутныя слухалі выступленне начальніка ідэалагічнага аддзела С. Д. Вярцінскай, якая распавяла аб поспехах краіны і здабытках ШумілінШчыны. Ірына Новікава адказвала на пытанні, якія тычыліся праблем жыллёва-камунальнай тэматыкі, добраўпарадкаваня калгаснага рынка, фізкультурна-аздараўленчага комплекса. Былі закрануты вузкапрафесійныя пытанні і нават тыя, якія будуць вырашацца на бліжэйшую перспектыву. Пабывалі дэлегацыі прапагандыстаў і на Обальскім керамічным заводзе. Дзень інфармавання на заводзе праходзіў па актуальнай для ўладнай вертыкалі тэме – Усебеларуская народная сход. У сустрэчы з рабочымі прыняў удзел сталічны госць – галоўны рэдактар "Рэспубліка" А. І. Лемяшонак. Рэдактар дзяржаўнага выдання ўхваліў палітыку цяперашняга кіраўніцтва краіны, выказаў свае меркаванне аб адносінах з Расеяй. Трэба адзначыць, што Анатоль Іванавіч займае пасаду старшыні ГА "Беларускі саюз журналістаў". Лемяшонак заверыў прысутных, што на Беларусі ёсць свабода слова і друку. Безумоўна, рэдактара "Рэспублікі" такая "свабода" друку задавальняе, магчыма ён не ведае, як шумілінцаў прымушаюць выпісваць дзяржаўную прэсу. Тым больш, што падчас размовы "нязручных" пытанняў яму ніхто не задаваў, актавая зала завода – не месца для дыскусій. Ці ёсць карысць ад такіх мерапрыемстваў? Безумоўна ёсць. Татальны кантроль улады за народам, каб той не праявіў актыўнасць. У суседняй Расіі нават словаблуддзе прыдумалі "управляемая демократия". Здаецца, што нашы шумілінскія ідэолагі добра засвоілі ўрокі па самазахаванню наменклатуры, якая распладзілася яшчэ ў савецкія часы.

**Аляксандр Шчамлёў.**

## ХЛЕБАРОБСКАЕ СВЯТА

Цяперашняя ўлада самую мірную прафесію хлебароба калгасна-саўгаснай сістэмай уцягнула ў бясконцую барацьбу за перамогу. Праўда, цяпер пафасныя лозунгі накшталт "Бітва за ураджай" або "Жывёлагадоўля – ударныфронт" ужо не гучаць. Затое ўсе механізатары не проста працуюць на полі, але адначасова з'яўляюцца ўдзельнікамі спаборніцтваў паміж калгасамі нашага раёна і "экіпажамі" камбайнаў. У гэтым годзе шумілінскім хлебаробам давялося спаборнічаць у экстрэмальных умовах. Сама прырода падрыхтавала ім сапраўднае выпрабаванне: марозная зіма, дажджлівая вясна і спякотнае лета. Нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е, працаўнікі сяла выканалі мерапрыемствы Дзяржаўнай праграмы па развіцці сяла. У суботу 20 лістапада ў прыгожым аграгарадку Мікіціха святкавалі раённыя Дажынкі. Аб дасягненнях раёна і нялёгкім хлебе сельскіх працаўнікоў казаў у сваім выступленні кіраўнік раёна В. А. Падляшчук. Вальдэмар Антонавіч прывёў лічбы ўсіх асноўных паказчыкаў сельгасвытворчасці. Асаблівы гонар раёна – аграгарадкі. За апошнія пяць год у Шумілінскім раёне пабудавалі восем аграгарадкоў, на якія затрацілі 21 мільярд бюджэтных грошай. Асабліва парадаваліся вяскоўцы, калі да іх дамоў правялі прыродны газ. Блакітнае паліва прыйшло ў Мікіціху, Башні, Амбросавічы, Слабаду, пасёлак Светласельскі. Нарэшце надышоў самы хвалюючы момант. Ва ўрачыстай абстаноўцы начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Генадзь Кісялевіч узнагароджвае тых, хто заняў прызавыя месцы ў раённых спаборніцтвах. Ударнікі атрымалі грашовыя прэміі, каштоўныя падарункі, пахвальныя граматы. Лепшым камбайнерам прызнаны Сяргей Гоманаў з "Райаграсервісу", нязменны лідэр на палетках ШумілінШчыны. Бадай, самым адметным быў той факт, што на свята запрасілі маладога механізатара з калгаса "Прызаёрны" Мікалая Жыгунова. Калгаснік не хавае гонару ад таго, што яго прызначылі дэлегатам на Усебеларускі народны сход. Цікава, ці ўсведамляе малады чалавек, у якасці каго ён будзе там прадстаўлены? Напрыканцы мерапрыемства пасля афіцыйнай часткі з віншаваннем і падарункамі, увазе гасцей і ўдзельнікаў свята самадзейныя артысты далі цудоўную канцэртную праграму.

**У. Арэшкін.**

## МЯСЦОВЫЯ КРЫНІЦЫ ДАХОДНАЙ ЧАСТКІ БЮДЖЭТУ

На адным з выступленняў кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі прагучала папулярнае выказванне:"Калі няма даходнай часткі бюджэту, то гэта азначае, што трэба скарачаць расходную". Зразумела, што Аляксандр Рыгоравіч меў на ўвазе буйныя гарады, дзе можна скараціць празмерна раздутыя штаты чыноўнікаў і адмяніць бязглуздыя дарагія праекты. Шчыра кажучы, нашаму раёну гэта не пагражае, асабліва пярвічным органам мясцовага самакіравання. Бюджэты сельвыканкамаў амаль пустыя – нярэдкі выпадкі, калі сродкаў не хапае для фінансавання шэрагу праблем, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Менавіта тэма папаўнення рахункаў сельвыканкамаў стала галоўнай на чарговым пасяджэнні прэзідыума раённага савета дэпутатаў, якое адбылося 9 лістапада. Старшыню райсавета Ірыну Новікаву непакоіць няпростая сітуацыя па прыцягненню сродкаў у мясцовыя бюджэты. Пры гэтым з дакладам па найбольш важнаму пытанню выступіла начальнік фінансавага аддзела райвыканкама Алена Сідарэвіч. На яе думку, супрацоўнікі сельвыканкамаў наўпрост недапрацоўваюць па папаўненні сваіх рахункаў. На сённяшні дзень толькі ў адным Мікалаеўскім сельскім Савеце ўмеюць зарабляць грошы, астатнія больш спадзяюцца на дапамогу з цэнтра. Усяго быў распрацаваны 21 артыкул, па якіх можна вылічваць з насельніцтва грошы. Аднак налічэнні ў бюджэт паступілі толькі па 17 артыкулах, ды і тыя былі задзейнічаны ў тым жа Мікалаеўскім сельвыканкаме. У сувязі з гэтым старшыні сельсаветаў трымалі справаздачу перад старшынёй райсавета І. Новікавай. Відавочна, што іспыты кіраўнікі мясцовых органаў улады на гэты раз вытрымалі. У Шумілінскім раёне паўсюдна склалася крытычная сітуацыя са спагнаннем падаткаў на зямлю і нерухомасць. Разам з тым не асвойваюцца сродкі па зносу старых хат і струхлелых пабудоў. Да прыкладу, у Каўлякоўскім сельсавеце асволі два мільёны рублёў, пры тым, што было выдзена 7 мільёнаў. А Мішнявіцкі сельсавет наогул не знёс ніводнай хаты і не асвоіў ніводнага рубля. Дрэнна вядзецца работа кіраўніцтвам мясцовай улады па спагнанню грошай па адміністрацыйных пакараннях. Між тым, парушальнікаў заканадаўства на вёсцы хапае, але адны работнікі РАУС з гэтай праблемай не справяцца, ля кожнага слупа міліцыянта не паставіш. Як заўважыла старшыня Каўлякоўскага сельсавета Т. А. Дзятлава, трэба рабіць больш упор на прафілактычныя меры з прыцягненнем да работы грамадскасці. Пажадана прызначыць адказных асоб, якія будуць выяўляць правапарушэнні. Вясковую моладзь павінны выхоўваць дырэктары школ – ім трэба наладзіць работу школьных патрулёў. Праўда і тое, што на вёсках ёсць старэйшыны, але яны працуюць на грамадскіх пачатках, а кіраўніцтва сельсаветаў не заахвочвае іх ні матэрыяльна, ні маральна. Старшыні сельвыкакамаў вымушаны былі апраўдвацца і па росту колькасці злосных неплацельшчыкаў. Старшыня Светласельскага сельсавета В. В. Шчарбакоў скардзіўся на дачнікаў, якія маўляў, хаты скупілі, а свой адрас не пакінулі. Даводзіцца шукаць, пісаць паперэджанні, а ў выніку не сабрана і палова падаткаў на нерухомасць і зямлю, а крайні тэрмін да 15 лістапада. Нічога не зробіш, вёска выміраe, а моладзь з'язджае. Адкуль узяць падаткапалацельшчыкаў?

**Алесь Шумскі.**




## "СВІТАНАК" У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале http://kamunikat.org/, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: http://kamunikat.org/svitanak.html , што у каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.**

## АБ'ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя « Світанка » змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам***

# Устойлівая тэндэнцыя алкагольнай залежнасці

Праблема п'янства ў нашым грамадстве надзвычай балючая – гэта ганебная з'ява падрывае ўсе жыццёвыя асновы, калечыць лёсы, разбурае сем'і, робіць няшчаснымі многіх людзей. Паводле афіцыйных дадзеных, кожны 50 жыхар Беларусі з'яўляецца алкаголікам. Як канстатуе пракуратура, сёння ў Беларусі складаецца на ўліку ў лекараў нарколагаў 180 143 хворых на алкагалізм. Сёння, як ніколі раней, сталі актуальнымі мерапрыемствы па выкананню Дзяржаўнай праграмы нацыянальных дзеянняў па папярэджанню п'янства і алкагалізму. Але большасць праграм, распрацаваных на мясцовым узроўні, па-ранейшаму не даюць жаданых вынікаў. А якая эфектыўнасць работы кіраўніцтва нашага раёна па перадоленні п'янства і алкагалізму? Раённая пракуратура ўстанавіла, што ў нашым раёне назіраецца рост вытворчасці і рэалізацыі лікёра-гарэлачных вырабаў і гэтакзваныхпладова-ягадных він. Да прыкладу, у гандлёвых кропках Шумілінскага раёна на 1 кастрычніка гэтага года рэалізавана 2,0 тыс дал. лікёра-гарэлачных вырабаў, што да адпаведнага перыяду мінулага года складае 130 % Павелічэнне спажывання спіртнога садзейнічае развіццю ў насельніцтва алкагольнай залежнасці. Гэту сумную тэндэнцыю падцвярджае колькасць асоб, якія стаяць на наркалагічным уліку з дыягназам "хранічны алкагалізм". Зараз на ўліку ва ўрача-нарколагаШумілінскай раённай бальніцы стаіць 693 чалавекі. А гэта азначае, што кожны 33 жыхар ШумілінШчыны – алкаголік. Алкаголь стаў прамой прычынай смерці 9 чалавек, якія прынялі несумяшчальную з жыццём дозу спіртнога. Пры ўсім тым, памерлыя людзі на ўліку ў раённага нарколага не стаялі. Выходзіць, што хворых на алкагалізм у раёне значна больш, чым зарэгістравана лекарамі. Таксама непакояць факты ўжывання алкаголю непаўналетнімі асобамі – сёлета да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 19 падлеткаў, што на 9 больш у параўнанні з мінулым годам. Чаму расце колькасць людзей, якія злоўжываюць алкаголем? Па-першае, улада заваліла паліцы крамаў спіртовымі напоямі нізкай якасці, таму што гэта самы лёгкі спосаб папаўнення бюджэту. Па-другое, раённыя ўлады не заўсёды разумеюць, што менавіта даступнасць алкагольных напояў і нізкі кошт з'яўляюцца асноўнымі чыннікамі злоўжывання спіртным. Бутэлька пладова-ягаднага віннага напою, якое ў народзе ахрысцілі "чарнілам" каштуе ўсяго тры тысячы рублёў. Па-трэцяе, недахоп спецыялістаў: штатная колькасць лекараў псіхіятраў-нарколагаў укамплектавана ўсяго на 50%. Зрэшты, на заклікі ўлады: "Супраць п'янства – усёй грамадой" ніяк не адрэгавалі працоўныя калектывы, грамадскія арганізацыі і прафсаюзы нашага раёна. У большасці выпадкаў абмежаваліся фармальнымі акцыямі для справаздачы, і на гэтым справа скончылася.

**С. Горкі.**

# АСАБЛІВАЯ ЎВАГА

У якім выпадку дзяржава мае права ўмяшальніцтва ў справы сям'і? Напэўна пасля выхаду ў свет дэкрэта № 18 "Аб узмацненні кантролю за нядбайнымі бацькамі" дзяржава ў асобе сацыяльнага работніка лепш ведае, што патрэбна нам і нашым дзецям. І калі бацькі ствараюць пагрозу для здароўя і жыцця сваіх дзяцей, тады да іх завітае камісія з работнікаў райвыканкама. Камісія ўзброена інструкцыяй, дзе падрабязна напісана, якую сям'ю можана лічыць неблаганадзейнай. У тых дамах, дзе пануе антысанітарыя, бацькі злоўжываюць алкаголем, а дзеці недагледжаныя і галодныя. Пасля абследавання дамоў і выяўлення нібыта нядбайных сем'яў камісія прымае адпаведнае рашэнне: "паставіць на кантроль". Гэта азначае, што бацькам даецца час, для таго каб прыбрацца ў хаце, больш увагі надаваць дзецям. Калі гэта патрабаванне не выконваецца, сям'ю ставяць на улік. Тое, што сям'ю спачатку паставілі на кантроль – нічога страшнага ў гэтым няма. Проста да сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы, будуць рэгулярна наведвацца групы чыноўнікаў. Пад надзейнай дзяржаўнай апекай апынецца кожны куток кватэры, будуць праверaны лядоўні, шафы, ложкі, тумбачкі. Заглянуць правяраючыя і ў вёдры, каструлі, растлумачаць, колькі, чаго і якой якасці ўсяго павінна быць, каб бацькоў палічылі нармальнымі. Падчас апошняга рэйду ў Шуміліне правяраючыя аб'ехалі каля двух дзесяткаў сем'яў. Звычайна раз у тыдзень, у чацвер да неблаганадзейных бацькоў прыходзяць работнікі аддзела адукацыі, дактары, работнікі міліцыі. На гэты раз камісія ў складзе ўчастковага інспектара РАУС Ю.Сільвестрава, юрысткансульта В. Емяльянава і пажарніка А. Лявонава наведалі ў асноўным шматдзетныя сем'і, у якіх пражываюць непаўналетнія дзеці. Як высветлілася, у гэты дзень з бацькоў ніхто не напіўся. Аднак беднасць паўсюдна змрочвае жыццё гэтых людзей: мала прадуктаў, не хапе паліва на зіму, няспраўныя печкі, электраправодка патрабуе замены, у некаторых электрычнасць адключана за няўплату. У сям'і грамадзянкі В. бялізна сушылася на неадрамантаванай печы, скрозь дзіркі якой прасвечвалася полымя. Жанчына выхоўвае дваіх дзяцей і не разумее, пад якой небяспекай яны знаходзяцца. У адным з прыватных дамоў жыве пенсіянер і яго сын з сужыцелькай, двое непаўналетніх дзяцей. Усе дарослыя маюць судзімасці і пакутуюць на алкагалізм. Калі яны нецвярозыя, кідаюцца адзін на аднаго. Падчас апошняй бойкі пенсіянера ўдарылі па галаве конаўкай. Участковы ходзіць да іх ледзь не кожны дзень, папярэджвае і збірае матэрыял для адпраўкі ў ЛПП. Некалькі кватэраздымшчыкаў чакаюць суда – не плацілі за кватэру, за ваду і вываз смецця. Дарэчы, за вываз смецця трэба уносіць усяго адну тысячу ў месяц. І толькі адна маці стала на шлях выпраўлення – яе дзіця гадуецца ў належных умовах. У бліжэйшы час маладую жанчыну здымуць з кантролю. Вось каб яшчэ жадані і памкненні да нармальнага жыцця адзінокай маці з дзіцём былі добра падмацаваны адраснай дапамогай.

**Алесь Прыбярэжны.**

# Сем нянек і адзін выхаванец

З мэтай прафілактыкі злачыннасці ва ўсіх сельскіх саветах нашага раёна створаны грамадскія пункты аховы парадку. Яны павінны аб'ядноўваць іх высілкі прадстаўнікоў з органаў мясцовага самакіравання, добраахвотных дружын, працоўных калектываў па ахове грамадскага парадку. Прынамсі, паўплываць на паводзіны асоб з гэтак званай "групы рызыкі" сіламі толькі супрацоўнікаў міліцыі немагчыма. А што канкрэтнага могуць зрабіць пункты аховы парадку, каб выправіць сітуацыю? Гэта работа вядзецца сістэмна, або як заўсёды, калі ад парушальніка ўжо пацярпелі законапаслухмяныя грамадзяне? У якасці прыкладу можна прывесці апошняе пасяджэнне, якое нядаўна адбылося ў Дабейскім сельсавеце. На пасяджэнне грамадскага пункта аховы парадку даставілі жыхара Дабеі П. , які пражываў у аднапакаёвай кватэры двухпавярховага дома. Гэты грамадзянін трапіў сюды не выпадкова, яго бясконцыя п'янкі і антысацыяльныя паводзіны ўжо "дасталі" суседзяў і аднавяскоўцаў. Справу разглядалі сем прадстаўнікоў грамадскасці на чале са старшынёй Дабейскага сельвыканкама Ірыны Шалахавай. Прысутнічалі ўчастковы інспектар, прадстаўнікі адміністрацыі мясцовай гаспадаркі – калгаса "Прыазёрны" і інш. Грамадзянін П. даўно нідзе не працуе, не мае пашпарта і рэгістрацыі, перабіваецца выпадковымі заробкамі, карацей кажучы тыповы вясковы "бамж", але мае свой вугал. Толькі той вугал ператварыў у хлеў, задымлены тытунём, абгарэлым ложкам, на якім неаднаразова засынаў п'яны з цыгарэтай. Выхавацелі доўга папракалі парушальніка за антыграмадскія паводзіны, а зытым узялі з яго слова, што ён больш не будзе бадзяжнічаць і піць гарэлку. Камісія паклапацілася аб тым, каб мужчыну ўладкавалі на працу на месцы жыхарства. Чалавеку далі апошні шанс на выпраўленне. Хочацца верыць, што гэты небарака пачне сваё жыццё з чыстага ліста. Як запэўніла старшыня мясцовага калгаса, у гаспадарцы наладзілі строгі кантроль за работнікамі: праводзіцца тэсціраванне на алкаголь. Але далёка не сакрэт, што рабочыя ў калгасе як пілі, так і п'юць –гэта бачна па зводках з пракуратуры. У той жа дабейскай краме за месяц прадаюць па некалькі сотняў літраў спіртовых напояў. А калі мужчыну ўсё ж такі адправяць на ЛПП, то лягчэй не стане – на яго месца прэтэндуюць ужо некалькі кандыдатаў. Пакуль што не бачна той работы з боку мясцовых органаў улады, каб зменшыць продаж і спажыванне спіртных напояў, процістаяць далейшай алкагалізацыі насельніцтва. Тут нашы чыноўнікі займаюць пазіцыю пасіўных назіральнікаў. А можа гэта ім выгадна, выходзіць так, што п'яным народам лягчэй кіраваць?

**Я. Вайтовіч.**

# Новыя выставы ў музеях

Са стварэннем аграгарадка Лаўжанская сельская бібліятэка перасялілася ў новы будынак. У прасторнай зале быў створаны музей этнографіі і фальклору. Экспанаты для музе пачалі збіраць некалькі год таму: юныя краязнаўцы з гуртка "Вясёлка" ладзілі экспедыцыі ў аддаленыя вёскі да мясцовых старажылаў. Прычым цікавіліся народнай творчасцю: прыпеўкамі, загадкамі, прымаўкамі. Цяпер, калі з'явілася магчымасць для пашырэння экспазіцыі, музей займеў каля сотні экспанатаў, якія адлюстроўваюць быт і звычкі шумілінскага краю. Найбольш прывабныя куткі краязнаўчых матэрыялаў: "Традыцыйнае ўбранне беларускіх жанчын", "Мікіціхінскія самародкі" і інш. На базе экспазіцыі праводзяцца святы для бацькоў і дзяцей, наведвальнікаў бібліятэкі, усіх жадаючых, хто цікавіцца этнаграфіяй нашага раёна. І гэта яшчэ не ўсё. Шумілінскі краязнаўчы музей запрашае жыхароў раёна наведаць выставу агнястрэльнай зброі. Шумілінцы змогуць пабачыць крэмневыя пісталеты, мушкеты, гарматы, халодную зброю і старажытныя гербы з краін Заходняй Еўропы і ЗША. Выстава працуе да 9 снежня ў Шуміліне, з 11 снежня у гарадскім пасёлку Обаль.

**С. Горкі.**

# ПАВАЛ ЛЕВІНАЎ «ВЫКЛЮЧЫЎ» СТАРШЫНЮ ЎЧАСТКОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ

Паводле скаргі віцебскага праваабаронцы старшыня Андрэй Маркоўскі выключаны са складу ўчастковай камісіі № 35 у Першамайскім раёне. ЦВК прызнаў, што фармаваньне камісіі адбылося з парушэньнем выбарчага заканадаўства.

Павал Левінаў паведаміў, што атрымаў адказ на сваю скаргу ў ЦВК пра парушэньне пры фармаваньні ўчастковай камісіі, у якую спрабаваў трапіць сам.

Калі спадара Левінава туды не ўключылі, адбыўся судовы працэс паводле скаргаў грамадзян, якія яго вылучалі. Падчас суду спадар Левінаў зьвярнуў увагу на тое, што ў камісію № 35 адны і тыя самыя асобы нібыта рэкамэндавалі і яго, і намесьніка дырэктара прадпрыемства «Віцебскхлебпрам» Андрэя Маркоўскага.

На думку Паўла Левінава, гэта ўжо было відавочным парушэньнем закону: подпісы за вылучэньне Маркоўскага варта было прызнаць несапраўднымі ўжо таму, што яны сабраныя пазьней — а кожны грамадзянін можа рэкамэндаваць толькі аднаго прадстаўніка ў выбарчую камісію. Пазьней Павал Левінаў абышоў кватэры, пазначаныя ў падпісных аркушах за вылучэньне Маркоўскага, і высьветліў, што прынамсі двое грамадзян сваіх подпісаў не давалі ўвогуле, расьпісаўшыся толькі за вылучэньне Паўла Левінава. Іхныя заявы праваабаронца і прыклаў да ліста ў ЦВК.

У атрыманым адказе напісана, што Цэнтравыбаркам правёў выязную праверку па гэтых фактах, кажа Павал Левінаў. Але праваабаронца падкрэсьлівае, што да яго асабіста ніхто не зьвяртаўся. Тым ня менш старшыню ўчастковай камісіі выключылі.

Цяпер Павел Левінаў чакае адказу зь Першамайскай раённай пракуратуры. Ён падаў туды заяву, каб знайшлі і пакаралі вінаватага ў падробцы дакумэнтаў і парушэньні выбарчага заканадаўства.

**Паводле "Радыё Свабода".**

## ЗДАРЭННІ. КРЫМІНАЛ

### НЕ ЎСТУПІЎ ДАРОГУ

Кіроўца МАЗа, рухаючыся ў бок Полацка на дарозе паміж Язвінам і Шумілінам пры развароце не ўступіў дарогу "Мерседесу". У выніку сутыкнення кіроўца іншамаркі жыхар Новаполацка загінуў. Пасажыр ¬легкавушкі – яго 12-гадовы сын трапіў у шпіталь. Па факту аварыі праводзіцца праверка.

### КАНЯ ЗБЫЛІ ЦЫГАНАМ

У саўгасе Мішневічы з фермы знік рабочы конь. Неўзабаве супрацоўнікі Шумілінскага РАУС знайшлі злодзеяў, якія скралі каня. Як высветлілася, гэта былі двое мясцовых жыхароў. Заведзена крымінальная справа, мужчынам пагражае пазбаўленне волі да пяці гадоў.

### НАЧНЫ ВЕРХАЛАЗ

З вёскі Гаравыя ў міліцыю паступіла паведамленне ад загадчыцы магазіна. Невядомы злодзей ноччу ўзламаў дах і вынес з магазіна прадуктаў і тавара на суму 368 тысяч рублёў. Злодзей затрыманы, ім аказаўся мясцовы рэцыдывіст. Цяпер яму пагражае яшчэ некалькі гадоў турмы.

ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ

# Выступы кандыдатаў у прамым эфіры

***Прапануем чытачам тэзы выступаў кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь паводле "Радыё Свабода"***

## ВІТАЛЬ РЫМАШЭЎСКІ: "АБІРАЛІ ПРЭЗЫДЭНТА — АБРАЛІ ЦАРА"

• Абіралі прэзыдэнта — абралі цара, які клапоціцца толькі пра сваіх сыноў

• Улада абараняе толькі сябе і чыноўнікаў. Карупцыя дасягнула 100%.

• Сытуацыя з цэнамі на харчаваньне перасягнкла ўсе межы. Цэны вырасьлі, і рост працягваецца…

• Ахова здароўя — даўно не бясплатная.

• Сёньняшняя ўлада ставіцца да народа, як да быдла.

• Выбараў няма.

• Беларусь — у лідэрах па самагубствах.

• Дапамога на дзяцей — падобная на зьдзек.

• Колькасьць насельніцтва істотна скарацілася. За часы кіраваньня Лукашэнкі насельніцтва скарацілася на 850 тысячаў. Не дажываюць да пэнсіі 62%.

• Паўсюль — на вучобе, на працы — нас палохаюць.

• Дзе зьніклыя апанэнты Лукашэнкі? Чаму трымаюць у турме Аўтуховіча? Каб баяліся іншыя!

• Запрашаю на Кастрычніцкую плошчу 24 лістапада.

• Новая канцэпцыя нацыянальнай палітыкі — арыентаваная на чалавека, на хрысьціянскія каштоўнасьці. Прабеларуская. Сям'я — прыярытэт.

• Грамадзтва для веруючых і няверуючых.

• Хрысьціянскія каштоўнасьці.

• Наша праграма — замяніць усю сыстэму.

• Пэнсіі — крыху больш за 100 даляраў. Нашы з вамі бацькі вымушаныя працаваць, каб дапамагаць нам. Падвысіць пэнсіі да эўрапейскага ўзроўню — проста. Перададзім акцыі «Беларуськалію» ў пэнсійны фонд.

• Эканоміка. Сацыяльна арыентаваная рынкавая. Прыклад — Нямеччына.

• Беларусь — эўрапейская краіна, здольная стварыць эўрапеўскую эканоміку.

• Бізнэс. Заснаваць сваю справу можна будзе цягам 1 дня. Адменім мыта на аўтамабілі, якія ўвозяцца з-за мяжы.

• Мы ўвядзем эканамічную канстытуцыю.

• Спыніць карупцыю можам толькі разам. Улада будзе не прызначацца, а абірацца.

• Аднаўленьне рэгіянальнага самакіраваньня.

• Будуць выбары на ўсіх узроўнях.

• Будзе рэгіянальная рэформа: не 6 абласьцей, а 23.

• Дапамога па доглядзе за дзіцём — на ўзроўні сярэдняга заробку.

• Кошты на кватэры завышаныя. Увядзем гіпатэку.

• Бясплатная адукацыя.

• Вернем ільготы студэнтам. Адменім сучаснае прыгоннае права — разьмеркаваньне.

• Вернем павагу да міліцыі. Гарантую, што улада ня будзе ўмешвацца ў працу праваахоўных органаў.

• За дробязь — у турмы, а хто крадзе мільёны — не сядзіць.

• Войска. Зборы да 3-6 месяцаў. Гэта дастаткова, каб навучыцца бараніць краіне.

• Будуць прыстойныя заробкі афіцэраў.

• Зьнізім цэны на візы.

• Беларуская мова і культура: нікога любіць мову і культуру прымушаць ня будзем.

• Заклікаю ўсіх удзельнічаць у гармадзкім жыцьці, ісьці ва ўладу.

• Важна ня як галасуюць, а як лічаць галасы. У выбарчых камісіях — толькі прыхільнікі ўлады.

• Студэнтаў прымушаюць ісьці галасаваць датэрмінова. Давайце не аддамо падмануць сябе. Прыходзьце галасаваць толькі ў дзень выбараў.

• Толькі разам зможам спыніць фальсыфікацыю вынікаў выбараў.

• Народ мае права абіраць уладу. Інакш — мы маем права на канстытуцыйную забастоўку.

• Прыходзьце на Плошчу.

## АЛЕСЬ МІХАЛЕВІЧ: "Я НЕ ХАЧУ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У СПАБОРНІЦТВЕ АБЯЦАНЬНЯЎ КАНДЫДАТАЎ"

• Эканамічны рост. Умовы для малога і сярэдняга бізнэсу.

• Эфэктыўная дзяржава — падзел уладаў. Рэформа мясцовага самакіраваньня.

• Наша эканамічная мадэль была эфэктыўна ў 90-х гадах і першых гадах цяперашняга стагодзьдзя. Цяпер — не.

• За 20 гадоў не пабудавана ніводнага буйнога прадпрыемства. Звышпрыбыткаў цяпер няма, і, думаю, іх ня будзе.

• Як стаўляюся да Мытнага зьвязу? Калі ён будзе эфэктыўным — буду рабіць высновы.

• Менш ідэалёгіі — больш эканомікі!

• Крэдыты, якія бралі былыя ўлады, трэба будзе вяртаць. Інакш да нас не прыдуць патэнцыйныя інвэстары.

• Мяне не палохаюць інвэстыцыі з Расеі. Як і іншыя... Але шмат хто з расейскіх інвэстараў — беларусы, якія працуюць там.

• Чаго чакаць вайскоўцам? Войска патрэбна. У сьвеце — шмат канфліктаў. Я прапаную, каб Беларусь была нэўтральнай дзяржавай.

• Кожны афіцэр павінен быць упэўнены, што пасьля сканчэньня службы атрымае дом пад Менскам. Служба павінна быць прэстыжнай.

• Ці патрэбная амністыя? Я не прыхільнік шматлікай амністыі. Большасьць сядзіць за злачынствы. Але шмат — за эканамічныя злачынствы. Трэба зрабіць прадуманую амністыю за эканамічныя злачынствы.

• Я — за прыватную ўласнасьць на зямлю. Права ўласнасьці на зямлю павінна быць гарантаванае.

• Мы павінны наладжваць стратэгічнае партнэрства як з Расеяй, так і з Эўразьвязам. Пабач — Украіна. Скандынавія важная. Добрыя адносіны павінныя быць як на Захадзе, так і на Ўсходзе.

• У бліжэйшыя 10 гадоў уступленьне Беларусі ў Эўразьвяз — нерэальнае. Але партнэрства павінна стаць сур'ёзным прыярытэтам.

• Трэба зрабіць, каб жыхары Эўразьвязу маглі езьдзіць да нас без візаў.

• Павінная быць мадэрнізацыя ўлады.

• Я прыхільнік таго, каб прэзыдэнт мог абірацца на сваю пасаду 2 разы.

• Павінна быць незалежнасьць судоў. Пакуль яны стаяць на абароне інтарэсаў дзяржавы.

• Наконт пытаньня пра вяртаньне да парлямэнцкай рэспублікі стаўлюся негатыўна. Павінен быць пост прэзыдэнта. Ён павінен ачольваць выканаўчую ўладу

• Я супраць прызнаньня Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі. Межы Эўропы не павінныя перакройвацца. Інакш зьявіцца шмат гарачых кропак.

• Я не абяцаю павышэньня пэнсій. Пасьля павышэньня — рост цэнаў, інфляцыя.

• Але калі будзе эфэктыўная эканоміка — дзеці будуць атрымліваць прыстойную зарплату.

• Барацьба з п'янствам. У асноўным прадаюцца чарніла, бырла. Павінна быць забарона на моцныя пладова-ягадныя віны. А на добрыя вінаградныя віны трэба адмяніць акцызы.

## МІКОЛА СТАТКЕВІЧ: "МНОГІЯ СТАРШЫНІ КАЛГАСАЎ ПРАЦУЮЦЬ ЛЕПЕЙ, ЧЫМ НЕКАЛІ КІРАЎНІК САЎГАСУ "ГАРАДЗЕЦ"

• Інфармацыю даюць СМІ, радыё і тэлебачаньне. Зь іх нельга нешта даведацца пра выбары і кандыдатаў.

• Тэлебачаньні пра іншых кандыдатаў не расказвае.

• На экранах адзін і той жа чалавек, 17 гадоў запар. А потым народ пытаецца: "А хто акрамя яго?" Ды ў нас 2 тысячы старшыняў калгасаў, якія працуюць ня горш за былога кіраўніка саўгасу «Гарадзец».

• Выбарчыя камісіі фарміруе вэртыкаль. А кіруе вэртыкальлю адзін чалавек. Участковыя камісіі — з аднаго працоўнага калектыву, дзе ўсе на кантракце.

• 5 дзён папярэдняга галасаваньня. Навошта? Заганяюць людзей, міліцыянтаў, вайскоўцаў, студэнтаў. Уначы скрыні без нагляду. А калі іх адчыняюць — усе за аднаго чалавека.

• У дзень галасаваньня пры падліку галасоў назіральнікаў адганяюць за 10 мэтраў, яны бачаць толькі філейныя часткі сябраў камісіі. Нават у Афрыцы — паказваюць бюлетэні ўсім.

• Захаду патрэбныя сумленныя выбары. Гатовыя даць вялікія сродкі — 3 млрд эўра за сумленныя выбары. Аказваецца, нам ня трэба. Адзін чалавек залез наверх і лесьціцу за сабой прыбраў.

• Ня мы, народ, ажыцьцяўляем уладу. Уладу ажыцьцяўляе адзін чалавек, які прызначае ўсіх зьверху.

• Дасталася ад СССР добрая прамысловасьць. За 20 гадоў — ніводнага новага прадпрыемства. За 17 гадоў Японія, ЗША сталі самымі разьвітымі краінамі. А мы за 17 гадоў запазычылі паўгадавы ВУП.

• Пэнсіянэры. Сорамна і грэх падманваць старых. Яны памятаюць вайну, холад і голад, — і вераць тэлевізару. Але ня ведаюць, як жывуць пэнсіянэры за мяжой: вандруюць у Эгіпэт, Гішпанію, Партугалію.

• Адукацыя стала платнай. Школьная рэформа: хістанні. Чаму міністар адукацыі не пакараны, чаму ён дагэтуль кіруе? Прычым, кіруе штабам аднаго з кандыдатаў.

• Правы на шчасьлівае дзяцінства маюць усе дзеці, а ня толькі адно дзіцё.

Што трэба зрабіць, каб зьмяніць сытуацыю? (Тут перайшоў на беларускую мову)

• Як ратаваць эканоміку? Малы бізнэс разьвіваць, а не душыць

• Трэба разьвіваць інвэстыцыйныя праекты.

• Пэнсію трэба прывязаць да заробкаў.

• Уклады. Абакралі народ — трэба вярнуць грошы. Украіна вярнула. І тут трэба вярнуць.

• Павінны быць ільготы для пэнсіянэраў і дзяцей.

• Патрэбныя палітычныя рэформы.

• Найперш — сумленныя выбары, каб быў нармальны парлямэнт.

• Наконт геапалітычных праблем. Краіна невялікая — сябраваць трэба з усімі. Ня толькі з Расеяй. Неабходна інтэграваца ў эўрапейскую прастору.

• Вось што павінен зрабіць сапраўдны прэзыдэнт, але ня робіць. (Зноў перайшоў па расейскую мову).

• Выбараў у нас няма. Выбары фальсыфікуюцца. Вынікі ўжо вядомыя. Навошта тады я іду на выбары? Я хачу зьмяніць гэта. Нам гэта трэба зрабіць разам.

• Не ўдзельнічайце ў датэрміновых выбарах — ваш голас скрадуць. Прыходзьце галасаць у дзень выбараў.

• Можна стаць незалежным назіральнкам. Патрабуйце, каб галасы лічылі пры вас.

• Заклікаў прыйсьці на Кастрычніцкую плошчу 24 лістапада а 18-й гадзіне.

## РЫГОР КАСТУСЁЎ: "ХТО НЯ КРАЎ — ТОЙ НЯ СЯДЗЕ"

• Мяне вылучыла партыя БНФ. З 1994 года гэта партыя не вылучала кандыдатаў. Я іду зараз на выбары пад бел-чырвона-белым сьцягам. Паказаў фота Філарэта і распавёў пра колеры бел-чырвона-белага сьцяга. Мы вернем сьцяг, а таго, хто будзе зьняважаць яго — пакараем.

• Лукашэнка назваў сябе праваслаўным атэістам. Няма нічога горш за атэістаў, якія забівалі нашых сьвятароў.

• Нам трэба падумаць, а ці правільна мы жывем. І праз выбары — добрая нагода даць ацэнку ўсяму ладу нашага жыцьця.

• На першы погляд — усё ў парадку, чыста, будуюцца аграгарадкі, лядовыя палацы. Але нядаўна быў знойдзены павешаным журналіст. Цэны растуць — бульба ў 3 разы, сьмятана — на 75%.

• Прычына ўсіх нашых бедаў адна — дыктатура. Я іду на выбары, каб вярнуць нашу краіну да дэмакратыі. Мне неабыякавы лёс Бацькаўшчыны як бацьку трох дзяцей.

• Але найперш трэба вярнуць законнасьць.

• Заклікаю да зьнішчэньня аўтарытарызму.

• На пераходны пэрыяд будзе сфармаваны ўрад народнага даверу — да парлямэнцкіх выбараў.

• Свабода прэсы будзе абаронена дзяржавай.

• Будзе скасаваная дзяржманаполія на тэлебачаньне.

• Старыя спэцслужбы будуць скасаваныя, а КДБ распушчана. Будуць створаны новыя спэцслужбы з прафэсіяналаў, якія сябе не заплямілі.

• Будзе мараторый на сьмяротнае пакараньне.

• Ня трэба палохаць чыноўнікаў люстрацыяй. Пераважная большасьць зь іх сумленныя людзі. Але Лукашэнка іх абражае

• Хто ня краў — той ня сядзе: ня бойцеся Рыгора Кастусёва.

• Ідэя Балтыйска-чарнаморскага калектара.

• Я працую ўсё жыцьцё на вытворчасьці. Мае веды практычныя.

• Беларускі народ можа жыць лепей.

• А мы жывём, як у анэкдоце пра бабулю, якая глядзела тэлевізар і плакала: хачу жыць у краіне, якую паказваюць па ТБ

• Беларусы будуць езьдзіць на новых іншамарках.

• Нашы праграмісты — найлепшыя ў сьвеце.

• Аўтуховіч змагаўся з карупцыяй, а зараз сядзіць у турме.

• Мыта на аўто не павінна павышацца, пакуль ня будзе сваёй вытворчасьці аўтамабіляў.

• Будзе створана агенцтва па прыватызацыі.

• Увядзеньне моцнай нацыянальнай валюты — талера.

• Тэрмінова неабходна спрасьціць падатковую сыстэму.

• Узгадаў дзяцей чыноўнікаў, якія працуюць на дыпляматычнай службе.

• Адукацыя павінна быць бясплатнай і прыстойнай.

• Трэба вярнуць ЭГУ на Беларусь.

• Беларусь павінна дасягнуць эўрапейскага ўзроўню разьвіцьця.

• Для гэтага трэба напружана працаваць. А беларусы ўмеюць працаваць.

• Неабходнае адраджэньне беларускай мовы.

• Патрэбная энэргетычная незалежнасьць.

• Дэмаграфічная сытуацыя выклікае жах. За апошнія 16 гадоў насельніцтва скарацілася амаль на мільён.

• Будзе рассакрэчана інфармацыя пра наступствы ўзьдзеяньня радыяцыі на насельніцтва. Чарнобыль працягвае забіваць беларусаў.

• Краіну завялі ў тупік. Лукашэнка больш ня можа кіраваць краінай.

• БНФ не гуляе па сцэнары ані Лукашэнкі, ані Масквы.

• Вы разгубленыя і ня верыце нікому. Уважліва глядзіце на ўсіх кандыдатаў: хто гаворыць на роднай мове, хто за нацыянальныя інтарэсы.

• Нам не патрэны ні хросны бацька 1, ні хросны бацька 2.

• Зьвяртаецца да сябраў учасковых камісій: на вас — вялікая адказнасьць.

• Разам мы здольныя дапагчыся лепшага жыцьця.

Завяршыў свой выступ воклічам «Жыве Беларусь!»

# Выступы кандыдатаў у прамым эфіры

## АНДРЭЙ САНЬНІКАЎ: ДА ЗЬМЕНЫ ЎЛАДЫ ЗАСТАЛОСЯ НЕКАЛЬКІ ТЫДНЯЎ

• Лукашэнка ўжо прайграў. Калі стэндаў зь ягонымі фатаграфіямі нікога не было. У яго няма падтрымкі народу. Ён нават асабіста не прыйшоў на ўручэньне пасьведчаньня кандыдата.

• Да зьмены ўлады засталося некалькі тыдняў. А пакуль краіну называюць апошняй дыктатурай Эўропы.

• 14 лістапада 1996 году краіна пачала скатвацца ў дыктатуру — калі зьнялі Ганчара з пасады старшыні ЦВК.

• Галоўная задача ЦВК з той пары, калі яго узначаліла Ярмошына, — фальсыфікацыя выбараў. Пра якія сумленныя выбары пры Ярмошынай можа ісьці гаворка?

• Увосень 1996 году я сышоў у адстаўку з пасады намесьніка міністра замежных спраў.

• Я прафэсійны дыплямат.

• Павінен быць падзел уладаў. Усе галіны павінны быць незалежныя. Суд і прэса — таксама.

• Нашы падаткі быццам бы ідуць на заробкі. Але настаўнікі, лекары — незадаволеныя заробкамі. Падаткі ідуць на курорты Лукашэнкі, утрыманьне Бакіева.

• У бюджэце няма грошай на лячэньне хворых дзяцей.

• У 1996 годзе Лукашэнка страціў права называцца законна абраным прэзыдэнтам. Пакуль дыктатары незаконна ўтрымліваюць уладу, яны пераконваюць народ, што краіна квітнее. Але народ ня верыць яму.

• Тэма зьніклых. Памер Карпенка. Зьнік Захаранка. Віктар Ганчар і Анатоль Красоўскі. Калі б яны засталіся жывыя, краіна была б іншай.

• Нядаўна мы зьвярнуліся да 5 пастаянных чальцоў ААН з просьбай расьсьледаваньня справаў зьніклых. Я ўдзячны прэзыдэнту РФ Мядзьведзеву за падтрымку.

• Народ наш запалоханы. Трымаюць кантрактнай сыстэмай, пагрозамі звальненьняў, высяленьняў з інтэрнату.

• Нельга галасаваць датэрмінова — галасы скрадуць.

• Беларусь стала вялікай пацёмкінскай вёскай.

• Маёй сям'і ня раз пагражалі. Абшуквалі нават дзіцячую калыску.

• Загінуў мой сябра Алег Бябенін, улады не расьсьледуюць справу.

• Мая каманда кажа: хопіць баяцца.

• Мы звычайная эўрапейская краіна. У 1991 годзе сталі незалежнымі, у 1996 — страцілі свабоду.

• Усе краіны супраціўляліся. Вугоршчына ў 1956, Чэхаславаччына ў 1968-м. Беларусь таксама змагаецца. Беларускі народ цярпліва толькі да пэўнага часу. Менавіта ў Беларусі быў створаны самы моцны партызанскі рух.

• Нас называюць апазіцыяй. Але ня мы апазіцыя, а той, хто жыве ў Драздах за высокім плотам.

• Галоўнай задачай лічу паляпшэньне жыцьця людзей. Праз 7 гадоў мы павінны дасягнуць лепшага жыцьця.

• Першы указ, які я падпішу — пра скасаваньне кантрактнай сыстэмы.

• Павінны быць моцныя прафсаюзы. Цяпер яны — інструмэнт кантролю.

• Прыбяром з школьных праграм ідэалёгію.

• Пэнсіянэры павінны жыць годна.

• Служба ў арміі стане сапраўднай школай для сапраўдных мужчын.

• Павінна быць зьнятая забарона з Чарнобыльскай праблемы.

• Інвалідам, чарнобыльцам мусяць быць вернутыя льготы.

• Прадпрымальнікам — будзе адменены указ №760.

• Нашы прадукты сельскай гаспадаркі павінны выходзіць на эўрапейскія рынкі.

• Павінен быць рост, рух наперад. Словы заможнасьць і ўласнасьць павінны стаць нармальнымі.

• Мне сорамна за хамства Лукашэнкі, які зьневажае падначаленых. (Узгадаў Машэрава і Колю ў генэральскай форме).

• Узгадаў выпадак з трагедыяй пад Смаленскам, калі не была абвешчана жалоба. Яшчэ больш сорамна за Пінскую трагедыю.

• Беларусь будзе рухацца ў Эўропу.

• Сёньня партнэры дыктатара — Іран і Вэнэсуэла.

• У краіне шмат эканамістаў-прафэсіяналаў.

• У мяне ўжо ёсьць сьпіс будучага ўраду, ёсьць праграма трансфармацыі эканомікі, падрыхтаваная разам з эканамістам Злотнікавым.

• Калі Лукашэнка цудам ўтрымаецца ва ўладзе, цэны на нафту стануць непад'ёмнымі, крэдыты не дадуць.

• Зьвярнуўся да бізнэсоўцаў, дзяржаўных служачых: прафэсіяналы будуць патрэбныя і новай уладзе, але цяпер трэба зрабіць свой выбар.

• Запрасіў народ на плошчу 19 сьнежня, дзе будуць самыя лепшыя мужчыны і самыя прыгожыя жанчыны.

## УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ: З ПАЭТА ПРЭЗЫДЭНТ НЯ ГОРШЫ ЗА ДЫРЭКТАРА САЎГАСУ

• Слухаць. Аналізаваць. Рабіць высновы. Прымаць рашэньні.

• З паэта можа паўстаць прэзыдэнт ня горшы, чым з старшыні калгасу. Узгадаў пры гэтым Вацлава Гавэла.

• Тры прынцыпы ў сваім жыцьці я спавядаў: прыстойнасьць, здаровы сэнс, павага да людзей.

• Распавёў пра кампанію "Напішы прэзыдэнту" з паштоўкамі, якія актывісты распаўсюдзілі па ўсёй краіне. Паштоўкі не прынялі ў адміністрацыі. Нікому не адказалі.

• Правялі кампанію па прысваеньні вуліцы імя Быкава. Сабралі больш за 100 тысяч — і атрымалі паўсюль "дулю".

• Яшчэ адна дэталь, якая характарызуе прыстойнасьць і павагу да людзей. Раз на 5 год Лукашэнка праводзіць Усебеларускі народны сход. Я таксама хацеў туды трапіць. Сабраў 27 тысяч подпісаў. Не патрапіў — на маім шляху ўстала ўся прэзыдэнцкая вэртыкаль, АМАП, міліцыя. На гэты сход патрапіў мой сябар, дэпутат Давыдзька, якога не выбіралі, а запрасілі.

• Таму я запрашаю на вакзал 6 сьнежня на вакзал — мы там правядзем сход.

• Яны сядзяць, як мышы пад венікам, — на сходах. А калі хтосьці асьмеліцца нешта запярэчыць — сядзь! І сядае, і рады, што на сваё месца, а не ў турму.

• Мяне таксама арыштоўвалі — маскі-шоў ўвараліся ў офіс, усё канфіскавалі.

• Літаральна ўчора Лукашэнка заявіў, што я атрымліваю расейскія грошы. У яго няма доказаў. А ў мяне — ёсьць. Усе гады свайго прэзыдэнцтва Лукашэнка клянчыў грошы ў Расеі. Як толькі яна перастала даваць — пасварыўся з Расеяй.

• Няма здаровага сэнсу ў абвастрэньні стасункаў з Расеяй. Трэба сябраваць з Эўразьвязам, але не за кошт сваркі з Расеяй.

• Прачытаў верш: "Стаю на асфальце, у лыжы абуты…" Стаяць у лыжах на асфальце — гэта і ёсьць стабільнасьць? Ды яшчэ зь міліцэйскімі палкамі?

• Чаму ў мяне столькі прэтэнзій да Лукашэнкі? Яго дзеяньні пачынаюць наносіць эканамічную шкоду краіне.

• Перайшоў да праграмы. Сяло трэба вывесьці з уласнасьці дзяржавы. Павінны зьявіцца гаспадары, сельскагаспадарчыя мэнэджэры.

• А ён шантажыруе начальнікаў: "Як у цябе прагаласуюць, тое і атрымаеш — крэдыты, рэсурсы".

• Тое самае і ў гарадах — людзі павязаныя кантрактамі.

• Наша сельская гаспадарка, калі яе не прыгнятаць, можа выраблясць столькі!

• Мы зможам выплачваць мацярынскі капітал. На дзіцяці, на яго рост, адзеньне, адукацыю.

• Мы не забудзем пра дзяцей вайны.

• Пэнсіі будуць павышацца, прывязвацца да заробкаў.

• Грошы не ў прэзыдэнта. Грошы — дзяржаўныя. Ня ён нас корміць і апранае, а мы яго.

• Другая крыніца атрыманьня грошай — у сярэднім і дробным бізнэсе.

• Трэцяя крыніца — тое, што называецца лідэрскай эканомікай. Трэба вывесьці прадпрыемствы з-пад дзяржаўнага кантролю.

• Усе эканамічныя праблемы ўпіраюцца ў палітычныя.

• Ня будзе вяртаньня да дыктатуры. Усё будзе добра. Вам хто толькі не абяцаў гэта. Паверце свайму паэту. Але калі я вам не буду падабацца — я за ўладу чапляцца ня буду.

• Уявіце такую карціну: Новы год. Вы прагаласавалі за новага прэзыдэнта — Уладзімера Някляева. Я вас віншую з Новым годам. А недзе каля елкі сядзіць каля тэлевізара Лукашэнка з сынам. А я дзякую яму, што ён захаваў незалежнасьць, сацыяльныя гарантыі... І дзякую, што ён не пайшоў на фальсіфікацыю выбараў. Уявілі карціну? І што здарылася? Нічога… Доўжыцца жыцьцё. Але пакуль яшчэ ня Новы год. Наперадзе выбары.

• Не хадзіце на датэрміновыя выбары. Нічога ня бойцеся.

• І яшчэ адно запрашэньне: 19 сьнежня а 20-й гадзіне прыходзьце на плошчу сьвяткаваць нашу з вамі перамогу.

• А 6-й вечара 6 сьнежня — Прывакзальная плошча. Мы разам, мы пераможам"

• Чытае верш "Я прыйшоў, каб вы перамаглі…". На гэтым выступ скончыўся.

## ЯРАСЛАЎ РАМАНЧУК: Я МАЮ ДАКЛАДНАЕ ЎЯЎЛЕНЬНЕ, ЯК МУСІЦЬ РАЗЬВІВАЦЦА КРАІНА

• Я маю дакладнае ўяўленьне, як мусіць разьвівацца краіна.

• 7 гадоў я парушаў працоўны кодэкс, працуючы на малаказаводзе ў дзяцінстве. З тых грошай купіў сабе ровар.

• У пошуку эканамічных рэцэптаў трэба ісьці ад жыцьця.

• Працаўнікі ў нас шмат зарабляюць, начальства яшчэ больш, але справядлівасьці ў размеркаваньні прыбыткаў няма.

• Мы, памяркоўныя, але з другога боку гэта ня вельмі добра. Калі ўвесь сьвет разьвіваецца хутка, а мы не — кепска. Сьвет робіць два крокі, а мы адзін.

• Калі вы замест «Жыгулёў» купляеце «Фольксваген», хоць і 5-гадовы, гэта абнаўленьне.

• Беларусь вартая ісьці разам зь лідэрамі сусьветнай эканомікі.

• Наша нацыянальная ідэя: пабудуем новае, захаваем лепшае.

• Мы прапануем захаваць чалавечы капітал: людзі — гэта ўсё.

• Людзі бягуць з краіны, дзе іх ня цэняць.

• БАТЭ — гэта прыклад таго, як людзі дасягаюць посьпеху безь дзяржаўнага пляну. Бо гэта людзі, якія ведаюць, што такое чалавечы капітал. Тое самае і беларуская баскетбалістка.

• Але ёсьць і людзі, якія хаваюцца за таблічкамі у бюракратычных калідорах. Ад іх памылак мы ўсе цярпім.

• Другі наш патэнцыял — нашы дарогі. Іх прыбіраюць нават лепш, чым ў Эўропе. Але выкарыстоўваем мы іх кепска. Бясьпека на нашых дарогах дрэнная, і ў выніку мы губляем транзітцераў. Канфіскацыя — біч нашай краіны. Штогод мы губляем каля 1 мільярда даляраў.

• Беларусь — як залаты склад, які даўно ніхто не адкрываў.

• Вялізная праблема — няма прыдарожнага сэрвісу, бо жорсткія бюракратычныя перашкоды. Кіпу папер трэба сабраць, каб адкрыць прыдарожную кавярню. Адна прадпрымальніца казала: два гады адкрывала кавярню і цяпер у яе няма дня без кантралёра, пажарнікаў, міліцыянтаў, якія хочуць, каб іх бясплатна кармілі. Тое самае зь зямлёй ля трасы: уладальнікі кавярні ў 60 км ад Магілёва не змаглі пачаставаць гасьцей кавай, бо ім зь Менску не прыслалі цэнаў!

• Нашы мытнікі — як салаўі-разбойнікі. Уся краіна — краіна салаўёў-разбойнікаў. Вялікія начальнікі бяруць шмат, малыя — меней.

• Вадаёмы і лясы — таксама наш велізарны патэнцыял. Сам я адпачываю летам толькі ў Беларусі. Але вакол азёр няма інфраструктуры.

• 6 гадоў прайшло ад прыняцьця праграмаў па нарачанскіх азёрах — нічога ня зроблена. ААН абвясьціла ваду самым галоўным рэсурсам. Мы самыя багатыя на вадзе, але ніяк не ня выкарыстоўваем.

• Зямля — тое самае. У Жлобіне мне жанчына сказала, што на зямлі мусіць быць гаспадар. Гэта сутнасьць маёй праграмы.

• Паказаў дзьве бульбіны — адну зь Беларусі — другую з Марока. З Марока — удвая танней. Гэта паказвае, наколькі эфэктыўна мы выкарыстоўваем зямлю. Грошы, якія мы ўкладаем у зямлю, разыходзяцца па кішэнях чыноўнікаў.

• Ці ўсё найлепшае ў нас дзецям? Чаму кожны другі малады чалавек хоча зьехаць з краіны? Чаму вучні мусяць плаціць за падручнікі? У Маскве нічога не плацяць! Навошта забіралі ў дзяцей ільготы на транспарт? Не магу зразмець. Дзеці мусяць езьдзіць на транспарце бясплатна.

• Колькі грошай мы гробім на праекты новабудоўляў? Мільярды замарожаныя!

• 100-150 эўра трэба плаціць ня толькі на дзіця, але і маці, бо адкуль ёй узяць даход?

• Трэба вярнуць пэнсіянэрам ільготы на транспарт.

• Гэта памылка, што пэнсіі плаціць Лукашэнка. Ён іх не зарабляў. Любы ўрад мусіць плаціць пэнсіі.

• Ці могуць нашы пэнсіянэры адпачыць на нашых базах адпачынку і санаторыях? Не. Там усё занята замежнікамі, асабліва летам. Вось рэальная сацыяльная палітыка сёньня. Яна падманвае: абяцае адно, а дае другое.

• Дэпутаты атрымліваюць пэнсію 1000 даляраў, а звычайны чалавек гарбаціўся ўсё жыцьцё, а атрымлівае 150 даляраў. Дзе справядлівасьць? Няма справядлівасьці!

• Мае дзяды назьбіралі цяжкай працай грошы і набылі зямлю, але прыйшла Савецкая ўлада і ўсе адабрала. Мае бацькі зьбіралі грошы, якія зьніклі з распадам СССР. Мы ня мусім кожны раз пачынаць з нуля.

• Мы не бунтары, мы за сумленны дыялёг бізнэсу з урадам.

• Падчас наступнага выступу раскажу, што трэба зрабіць для эканамічнага развіцьця.

• Трэба выпусьціць палітвязьняў.

• Трэба вызваліць прэсу.

• Кожны беларус мусіць свабодна выбіраць.

Аляксандар Лукашэнка правам выступу па тэлебачаньні а 19:30 не скарыстаўся.

# ЗРОБІМ ВЫБАРЫ СУМЛЕННЫМІ!

Рух «За Свабоду» прапануе актыўным грамадзянам, якім неабыякавы лёс краіны, стаць назіральнікамі на выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Стаць назіральнікам ад ПАГА "Рух "За Свабоду" можа кожны прыхільнік арганізацыі (нават, які не з'яўляецца яе сябрам). Дастаткова быць паўналетнім, даць сваю згоду на назіранне і прадставіць пэўныя асабістыя звесткі. **Анкету на назіранне магчыма атрымаць, патэлефанаваўшы ў рэдакцыю.** З валанцёрамі, якія вылучаюцца ад Руху "За Свабоду", будзе праводзіцца адпаведнае навучанне.

Назіральнікі змогуць прысутнічаць на выбарчым участку ва ўсе дні яго працы, назіраць за ходам галасавання, фіксаваць парушэнні Выбарчага кодэксу і, па магчымасці, прадухіляць верагодныя махінацыі з бюлетэнямі. Вылучаныя паводле ўстаноўленых правілаў назіральнікі маюць права заставацца на выбарчым участку пры падліку галасоў і назіраць за гэтым працэсам, у тым ліку – бачыць на ўласныя вочы бюлетэні з пазнакамі.

Удзел у назіранні за выбарамі – бясцэнны досвед, які дапаможа зразумець сутнасць і механізмы функцыянавання выбарчай сістэмы ў Беларусі.

Чым больш грамадзяне Беларусі будуць дасведчаныя ў асаблівасцях функцыянавання гэтага складанага дэмакратычнага інстытуту, тым лягчэй і хутчэй можна будзе дамагчыся нага ўдасканалення на карысць усяго нашага грамадства.

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандар Шчамлёў

**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы.
Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742

**Наклад:** 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна